## 1 чэрвеня 2024 г. - 20 гадоў з часу стварэння Дзіцячага рэабілітацыйна-аздараўленчага цэнтра «Колас» (Кобрынскі р-н; 2004)



Дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Колас» быў створаны ў адпаведнасці з загадам Камітэта па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі для аздараўлення дзяцей, якія пацярпелі ў выніку аварыі на ЧАЭС. Цэнтр пачаў функцыянаваць 1 чэрвеня 2004 года, а першыя дзеці прыбылі на аздараўленне 15 чэрвеня 2004 года.

Здраўніца знаходзіцца ў Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці на беразе ракі Мухавец. Да раённага цэнтра – 9 км, да абласнога – 32 км. Карпусы дзіцячага цэнтра размешчаны ў маляўнічым хвойным лесе на беразе ракі Мухавец у дзяржаўнай экалагічна чыстай зоне «Сасновы бор» плошчай 8,5 га. У наваколлі няма шкодных вытворчасцей.

База здраўніцы знаходзіцца на агароджанай тэрыторыі і размяшчае спальныя карпусы і спальны корпус сямейнага тыпу, лячэбна-аздараўленчы комплекс, ізалятар, адміністрацыйны будынак, будынак маркетынгу, корпус вольнага часу і клуб-сталовую, водалячэбніцу, краму, стаянку для аўтамабіляў. З кожным годам матэрыяльна-тэхнічная база ўдасканальваецца. З 2024 года запрацавала свая пральня. Вялікая ўвага надаецца добраўпарадкаванню тэрыторыі, яе азеляненню.

Першапачаткова магутнасць установы складала 140 ложкавых месцаў, зараз павялічылася да 532. За 20 гадоў аздараўленне ў цэнтры прайшло каля 130 тысяч чалавек. На санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне прымаюцца дзеці па чатырох узроставых катэгорыях: 3-6, 7-10, 11-13, 14-17 гадоў, - з раёнаў, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Адпачывальнікі знаходзяцца пад кругласутачным назіраннем медыцынскіх пастоў, размешчаных у кожным спальным корпусе, дзе аказваецца неадкладная дапамога, а таксама ёсць магчымасць атрымаць адпаведнае дыягназу медыкаментознае лячэнне.

Па выніках атэстацыі цэнтру прысвоена I катэгорыя санаторна-курортнай арганізацыі. Аздараўленне ў цэнтры праходзіць па многіх напрамках, сярод іх лячэнне органаў

стрававання, нервовай сістэмы, апорна-рухальнага апарата і іншыя. Лячэбна-аздараўленчы комплекс «Коласа» абсталяваны шырокім спектрам медыцынскай тэхнікі і сучасных апаратаў, што дазваляе на высокім узроўні праводзіць лячэнне і аздараўленне. Адпачывальнікі могуць наведаць кабінет стаматолага, фізіякабінеты. Папулярнасцю сярод працэдур карыстаюцца розныя лячэбныя ванны, душы, крыятэрапія. Функцыянуе зала для фізкультуры і СПА-кабінет. Добра арганізавана харчаванне: у рацыён уваходзяць карысныя прадукты, багатыя вітамінамі і мікраэлементамі.

Сёння ў «Колас» на аздараўленне прыязджаюць дзеці не толькі з забруджаных у выніку аварыі на ЧАЭС тэрыторый, але і дзеці з бацькамі па праграме «Маці і дзіця». Ёсць асобны катэджны пасёлак «Маці і дзіця», дзе можа размясціцца цэлая сям'я.

Вольны час у цэнтры арганізаваны на высокім узроўні. Ёсць гульнявая пляцоўка, працуюць розныя гурткі, арганізоўваюцца экскурсіі, канцэртныя праграмы, прагляд відэа- і мультфільмаў. Здраўніца валодае камфартабельным аўтобусам, на якім дзеці ездзяць на экскурсіі па культурна-гістарычных месцах Беларусі. Кожны год на базе ДРАЦ праводзяцца турзлёты, злёты юных інспектараў дарожнага руху

У навучальны час для дзяцей арганізаваны якасны адукацыйны працэс: 12 навучальных кабінетаў, камп'ютарны клас, бібліятэка з вялікай базай вучэбнай, метадычнай, мастацкай літаратуры, спартыўная, трэнажорная залы. Урокі вядуць вопытныя педагогі. Вялікая ўвага надаецца выхаваўчаму працэсу.

Аказваюцца платныя паслугі розным слаям насельніцтва. Інфрачырвоная саўна, масажныя крэслы, кабіны для сухіх вуглякіслых працэдур, апараты ультрагукавой тэрапіі, крыятэрапіі, саляны пакой, салярый, гідрамасажныя ванны, апарат УГД, апарат ЭКГ і інш. Ёсць магчымасць правесці на базе цэнтра карпаратыўныя, дзіцячыя святы.

Комплекснае ўздзеянне на арганізм кліматычнага фактару, фізіятэрапеўтычнага лячэння, дыетатэрапіі, вітамінатэрапіі, прыём мінеральнай вады дае выдатныя вынікі лячэння. Добрасумленная праца калектыву і яго дырэктара Юрыя Леанідавіча ЦЦітовіча, высокі прафесіяналізм і вялікі ўклад у справу аздараўлення і санаторна-курортнага лячэння неаднаразова адзначаўся рознымі ўзнагародамі.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г.
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі.

**Детский реабилитационно-оздоровительный центр «Колос»** // Здравницы Брестчины. - Брест, 2012. - С. 40-45 : фот.

**Детский реабилитационно-оздоровительный центр «Колос»** // Санаторно-курортные организации Республики Беларусь. - Минск, 2007. - С. 19.

**"Колос"**, детский реабилитационно-оздоровительный центр в Кобринском районе // Курорты и здравницы Беларуси. – Минск, 2008. – С. 133.

**Камунальнаму** ўнітарнаму прадпрыемству «Дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Колас» (2004) - 20 гадоў // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 145-146.

**Бакун, Е.** Шаг к успеху с суворовцами / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 20 ліпеня (№ 29). — С. 16 : фот.

В детском реабилитационно-оздоровительном центре "Колос" прошла встреча с гостями из Минского суворовского военного училища.

**Бакун, Е.** Яркое лето от "Колоса" / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 1 чэрвеня (№ 22). — С. 8 : фот.

О работе КУП ДРОЦ "Колос" Кобринского района.

**Бакун, Е.** За будущее в ответе / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 31 мая (№ 39). — С. 4 : фот.

О работе ДРОЦ "Колос".

**Бакун, Е.** С заботой о детях / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун и из архива ДРОЦ "Колос" // Кобрынскі веснік. - 2023. — 25 лютага (№ 15). — С. 10 : фот.

По результатам работы среди учереждений по оздоровлению и санаторно-курортному лечению за 2022 год КУП "Детский реабилитационно-оздоровительный центр "Колос" занял 3-е место в области.

**Бакун, Е.** Крепкий "Колос" / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 24 лістапада (№ 93). — С. 4 : фот.

Об опыте работы ДРОЦ "Колос" в условиях коронавирусной инфекции.

**Белов, Д.** В мир высоких технологий — вместе с МТС! / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2019. - 7 жніўня. - С. 5.

Основы робототехники постигали дети в "IT-лагере" МТС на базе ДРОЦ "Колос".

**Елизарова, Ж.** ДРОЦ "Колос" — только первые! / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 22 верасня. — С. 4.

В детском реабилитационно-оздоровительном центре "Колос" созданы все условия для отдыха и оздоровления.

**Ізафатава, С.** Турысты, яднайцеся! / Святлана Ізафатава // Настаўніцкая газета. - 2018. — 9 жніўня. — С. 3.

Каманда ДРАЦ «Колас» заняла першае месца ў рэспубліканскім турыстычным злёце.

**Пальто, К.** "Колос" принимал гостей / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2017. — 1 сакавіка. — С. 4.

Детский реабилитационный оздоровительный центр "Колос" принимал участников республиканского совещания.

**Дубіна, Л.** На ахове дзіцячага здароўя / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2016. — 23 красавіка. — С. 3.

Дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр "Колас" пачаў сваю дзейнасць 1 чэрвеня 2004 года.

**Савчук, М.** Боль Чернобыля на кобринской земле / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2016. — 28 апреля. — С. 2.

ДРОЦ "Колос" круглогодично принимает на оздоровление детей из районов, пострадавших во время аварии на ЧАЭС.

**Тимошук, А.** Чтобы всем было комфортно / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2016. — 13 лютага. — С. 3.

В ДРОЦ "Колос" нашли возможность принимать на оздоровление детей и взрослых с ограниченными возможностями.

**Савчук, М.** «Колосу» - 10 лет / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2014. — 5 июня. — С. 5.

**Бялоў, Д.** Стаўка - на якасць і тэхналогіі / Дзмітрый Бялоў ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013. — 11 снежня. — С. 1-2.

Рэспубліканскі семінар "Асаблівасці гаспадарчай дзейнасці ў рыначных умовах на базе дзіцячага рэабілітацыйна-

аздараўленчага цэнтра" прайшоў нядаўна на базе КУП ДРАЦ "Колас".

**Савчук, М.** "Дети Чернобыля" в "Колосе" / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2013. — 2 апреля. — С. 3.

Детский реабилитационно-оздоровительный центр "Колос" - хорошая база для лечения, оздоровления и отдыха детей из районов, пострадавших в результате аварии на ЧАЭС.

**Савчук, М.** Конкурировать в условиях рынка - это реально / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2013. — 19 декабря. — С. 3.

На базе одного из лучших в республике КУП ДРОЦ "Колос" прошел республикаснкий семинар.

**Савчук, М.** Центр "Колос" - для мам и их детей / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2013. — 11 апреля. — С. 2.

Второй год в ДРОЦ "Колос" функционирует отделение "Мать и дитя".

**Гром, А.** Правильное движение в "Артек"! / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2011. - 11 чэрвеня. - С. 3.

На базе ДРОЦ "Колос" проходил республиканский слёт юных инспекторов.

**Лазарева, И.** Оздоровление должно быть полноценным / Ирина Лазарева // Кобрин-информ. - 2011. - 14 июля. - С. 5.

Об оздоровлении и санаторно-курортном лечении в КУП ДРОЦ "Колос".

**Бялоў, Д.** Дзякуй за гасціннасць, "Колас"! / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2010. - 28 жніўня. - С. 3.

**Гром, А.** Все дороги ведут в "Колос" / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2010. - 6 лютага. - С. 1.

Республиканское совещание прошло в реабилитационно-оздоровительном центре "Колос"

**ДРОЦ "Колос"** приглашает// Кобрин-информ. - 2010. - 16 декабря. – С. 18.

**ДРОЦ "Колос"** приглашает // Кобрин-информ. - 2010. - 25 ноября. - С. 6.

**Охремук, Л.** Успех - в интеграции усилий / Лариса Охремук // Заря. - 2010. - 4 февраля. - С. 7 ; Вечерний Брест. - 2010. - 3 февраля. - С. 1,7.

На базе ДРОЦ "Колос" в д. Пески-2 прошло республиканское совещание, на котором подведены итоги работы по оздоровлению и санаторно-курортному лечению.

**Грышкевіч, С.** У "Колас" – па здароўе! / С. Грышкевіч // Настаўніцкая газета. – 2006. – 26 жніўня. – С. 3.

**Чопко, М.** А в "Колосе" лучше! / М. Чопко // Заря. – 2006. – 25 июля. – С. 1-2.

**Пянко, А.** Дзе сосны з небам гамоняць / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2005. – 8 кастрычніка. – С. 2.

ДРАЦ "Колос".

**Петров, Ю.** Кому он нужен, детский санаторий? / Ю. Петров // Заря. – 1999. – 28 октября.

Неподалеку от д. Пески Кобринского района – незаконченное строительство детского санатория на 210 мест.

Кобрынскі раён
Пескі
«Колас», аздараўленчы цэнтр
Санаторыі